Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**В. А. АДЗІНОЧАНКА**

# АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ ФІЛАСОФІІ

Практычнае кіраўніцтва
для самастойнай працы студэнтаў

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2022

УДК 101.3(076)
ББК 87.003я73
А 299

Рэцэнзенты:
доктар філасофскіх навук У. М. Калмыкоў,
кандыдат філасофскіх навук В. К. Барэцкая

Рэкамендавана да выдання навукова-тэхнічным саветам
установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны"

**Адзіночанка, В. А.**
А 299 Асноўныя паняцці філасофіі : практычнае кіраўніцтва / В. А. Адзіночанка ; Гомельскі дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2022. – 35 с.
ISBN 978-985-577-822-7

Разгледжаны толькі асноўныя паняцці філасофіі. Прыведзеныя азначэнні прызначаны для таго, каб студэнты маглі сфарміраваць агульныя ўяўленні аб тых пытаннях, якія ім выкладаліся ў вучэбным курсе па філасофіі. Паняцці размешчаны не ў алфавітным парадку і звязаны з тэмамі курса. Азначэнні паняццяў філасофіі ў кіраўніцтве вельмі простыя і схематычныя. Яны разлічаны на ўспрыманне студэнтаў розных спецыяльнасцяў.

Адрасавана студэнтам вну.

**УДК 101.3(076)**
**ББК 87.003я73**

**ISBN 978-985-577-822-7**

© Адзіночанка В. А., 2022
© Установа адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны", 2022

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЗМЕСТ

Уводзіны........................................................................................ 4
Філасофія як сацыякультурны феномен........................................... 6
Філасофія быцця................................................................................ 9
Філасофская антрапалогія.................................................................. 15
Тэорыя пазнання і філасофія навукі.................................................. 20
Сацыяльная філасофія........................................................................ 26
Літаратура............................................................................................ 34

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УВОДЗІНЫ

Дадзенае практычнае кіраўніцтва змяшчае асноўныя паняцці, якія будуць сустракацца ў курсе “Філасофія”, і якія студэнты павінны ведаць. Адна са сцецыфічных рысаў філасофіі заключаецца ў тым, што яе паняцці могуць мець самыя розныя азначэнні. Калі мы будзем разглядаць філасофскія вучэнні, то кожнае з іх ўяўляе сабой сваеасаблівую трактоўку рэчаіснасці са сваёй сістэмай паняццяў. У кіраўніцтве прыведзены найбольш распаўсюджаныя і простыя азначэнні асноўных паняццяў філасофіі. Яно прызначана для самастойнай працы студэнтаў. Выкарыстоўваць яго трэба пры падрыхтоўцы да семінараў і экзамена па філасофіі.

Неабходнасць яго выдання абумоўлена дзвюма фактарамі: папершае, тым, што курс філасофіі прадугледжвае вывучэнне вялікай колькасці разнастайнага фактычнага матэрыялу, які можна толькі схематычна выкласці ў лекцыях, і таму студэнты павінны самі засвойваць значную яго частку; па-другое, успрыманне любых філасофскіх ведаў патрабуе асабістых намаганняў дзеля таго, каб разабрацца ў тых праблемах, аб якіх ідзе размова. Таму толькі фармальнае праслухванне курса лекцый і потым здача экзамена не дасць патрэбнага выніку. Філасофскія веды, пры ўсёй іх складанасці і абстрактнасці, выконваюць пэўную ролю ў жыцці чалавека. Праз іх фарміруецца агульнае бачанне свету. Ва ўмовах сучаснага грамадства ў людзей могуць быць самыя розныя светапогляды. Галоўнае, каб яны былі асэнсаваныя. Праблема не ў тым, што чалавек будзе мець павярхоўны светапогляд, дрэнна, калі ён будзе скажоным, што прыводзіць да жыццёвай дэзарыентацыі. Вывучэнне філасофіі дазваляе асэнсаваць свае погляды, адмовіцца ад скажоных і набыць тыя, якія больш адпавядаюць сучаснасці.

У выданні прыведзены асноўныя філасофскія паняцці, якія будуць сустракацца ў курсе. Яны размешчаны не ў алфавітным парадку і суадносяцца з тэмамі, якія выкладаюцца ў курсе. Таму кіраўніцтва мае выключна дапаможны характар. Засваенне вучэбнага прадмета “Філасофія” павінна адбывацца на падставе лекцый, падручнікаў і дадатковай літаратуры. Кіраўніцтва можа ўжывацца пры знаёмстве з адпаведнай тэмай, а таксама пры падрыхтоўцы да экзамена. Перш за ўсё, яно павінна садзейнічаць таму, каб студэнты ўзгадалі змест адпаведнай тэме і сістэматызавалі свае веды.

Трэба падкрэсліць, што ў кіраўніцтве прыведзена толькі незначная частка тых асноўных паняццяў, якія ўжываюцца ў філасофіі. На самой справе такіх паняццяў вельмі шмат. Для больш поўнай карціны, студэнты

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

могуць азнаёміцца са слоўнікамі і энцыклапедыямі, якія размешчаны ў раздзеле “Літаратура”. Крыніцы, змешчаныя ў кіраўніцтве, ёсць у электронным выглядзе ў Інтэрнеце.

Практычнае кіраўніцтва не змяшчае паняцці, звязаныя з тэмамі вучэбнага курса, у якіх выкладаецца гісторыя філасофіі. Схематычнае тлумачэнне гэтых паняццяў дадзена ў выданні “Гісторыя філасофіі” (Адзіночанка, В. А. Гісторыя філасофіі : практычнае кіраўніцтва / В. А. Адзіночанка; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – 48 с.) Калі ў студэнтаў узнікне імкненне да больш глыбокага і змястоўнага разумення, то яны могуць звярнуцца да прыведзенага спісу літаратуры.

У філасофіі магчымыя розныя падыходы да рэчаіснасці. Можна даваць азначэнні паняццяў філасофіі, якія адрозніваюцца ад тых, што прыведзены ў кіраўніцтве, але яны павінны мець змястоўны характар. Студэнтам трэба ўлічваць, што значная частка вучэбнай літаратуры па філасофіі напісана ў рэчышчы марксісцкага падыходу. Тлумачыцца гэта тым, што да нядаўняга часу марксізм быў асновай афіцыйнай ідэалогіяй, і іншыя падыходы проста не дапускаліся. Зараз як ідэалогія марксізм страціў сваё значэнне, але як філасофскае вучэнне ён застаецца адным са спосабаў асэнсавання і тлумачэння рэчаіснасці, перш за ўсё, сацыяльнай. Таму і яго азначэнні з’яўляюцца магчымымі з улікам сучасных зменаў.

Студэнты павінны паспрабаваць зразумець спецыфіку філасофскіх праблем і суаднесці іх з тымі ведамі, якія атрымалі ў школе, а таксама з тымі, якія атрымліваюць па сваёй спецыяльнасці.

Трэба ўлічваць мэту, якая ставіцца пры выкладанні курса філасофіі на нефіласофскіх спецыяльнасцях. Яна мае азнаямляльны характар. У студэнтаў павінна быць сфарміравана самая агульнае і павярхоўнае ўяўленне аб тым, што такое філасофія, з якіх раздзелаў яна складаецца, якую ролю выконвае ў грамадстве і жыцці асобнага чалавека, якія асноўныя праблемы філасофіі і ключавыя філасофскія ідэі. Гэта садзейнічае фарміраванню цэласнага і паглыбленага светапогляду, разуменню характару сучасных праблем і магчымых спосабаў іх вырашэння. Вывучэнне філасофіі з’яўляецца часткай фарміравання каштоўнаснай арыентацыі маладых людзей.

У выданні дадзены агульныя і схематычныя звесткі пра асноўныя паняцці філасофіі, мэта якіх – садзейнічаць вывучэнню тэм вучэбнага курса. Рэкамендуецца пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў і экзамена пазнаеміцца з гэтымі схемамі і потым пачытаць канспект, падручнікі і дадатковую літаратуру.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ФІЛАСОФІЯ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН

**Філасофія** – гэта спосаб вывучэння і асэнсавання найбольш агульных і фундаментальных асноў рэчаіснасці і спосабаў яе развіцця, а таксама сістэма ведаў, якая ўзнікла на гэтым грунце. Слова *філасофія* (ад грэч. *phileo* – 'люблю' і *sophia* – 'мудрасць') у перакладзе азначае *любоў да мудрасці*. Лічыцца, што слова *філосаф* упершыню ўжыў старажытнагрэчаскі матэматык і мысліўца Піфагор у дачыненні да людзей, якія імкнуцца да высокай мудрасці і годнага ладу жыцця. Тлумачэнне і замацаванне ў еўрапейскай культуры тэрміну *філасофія* звязваюць з імём старажытнагрэчаскага мысліўцы Платона. Ён сцвярждаў, што мудрымі могуць быць адныя багі, людзі ж здольныя толькі імкнуцца да мудрасці, любіць яе. Тых, хто гэтым займаецца, Платон называў філосафамі, а іх занятак – філасофіяй.

Трэба ўлічваць, што азначэнне філасофіі – адна з глыбокіх філасофскіх праблем, якую кожны значны мысліўца вырашаў па-свойму. Таму азначэнняў філасофіі шмат. У залежнасці ад таго, якое з іх мы будзем выкарыстоўваць, залежыць наша трактоўка рэчаіснасці.

**Мудрасць** – характарыстыка стану свядомасці чалавека, якая арыентавана на цэласнае спасціжэнне рэчаіснасці ў адпаведнасці з яе фундаментальнымі сэнсамі, а таксама паводзіны, якія на гэтай падставе фарміруюцца. Дасягненне мудрасці прыводзіць да трансфармацыі асобы чалавека. Мудрасць можа быць сфарміравана на падставе штодзённага, міфалагічнага, рэлігійнага, навуковага і іншых светапоглядаў. Вельмі часта мудрасць атаесамляецца з духоўнасцю. Але трэба ўлічваць іх якаснае адрозненне: духоўнасць звязана са спасціжэннем надындывідуальных сэнсаў, якія ўспрымаюцца як “вышэйшыя”, мудрасць жа – уласцівасць асобы чалавека.

**Прадмет філасофіі** – той аспект рэчаіснасці, які філасофія вывучае. Прадмет філасофіі мяняўся, бо ў розныя часы існавала рознае разуменне, што такое мудрасць. Пры вывучэнні кожнага з этапаў развіцця філасофіі карысна вылучыць яго асноўны прынцып. Так для антычнай філасофіі ў цэлым характэрны касмацэнтрызм, для сярэднявяковай – тэацэнтрызм, для філасофіі Адраджэння – антрапацэнтрызм, для філасофіі Новага часу – навукацэнтрызм, для філасофіі 20 ст. – разнастайнасць філасофскіх школ і палеміка з папярэдняй традыцыяй, для філасофіі постмадэрнізму – сцвярджэнне аб канцы філасофскага развіцця. Такія характарыстыкі з'яўляюцца спрошчанымі і не ахопліваюць разнастайнасці філасофскай думкі таго ці іншага перыяду, але яны даюць схему яе разумення.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Філасофскія дысцыпліны** – навукі, якія маюць філасофскі характар. Да іх адносяцца: этыка – навука аб прынцыпах паводзін, эстэтыка – навука аб успрыманні рэчаіснасці з пункту погляду яе знешняй упарадкаванасці і мастацкай дзейнасці, логіка – навука аб спосабах правільных разважанняў, рэлігіязнаўства – навука аб рэлігіі, культуралогія – навука аб культуры.

**Функцыі філасофіі** – тыя ролі, якія філасофія выконвае ў грамадстве і жыцці асобнага чалавека. Неглядзячы на тое, што філасофскія веды маюць высокую ступень абстракцыі і складанасці, яны таксама для чагосьці прызначаны, што і выражаецца ў іх функцыях. Кожны значны мысліўца прапаноўваў сваё бачанне філасофіі і яе прызначэння. Да наступных асноўных функцый філасофіі адносяць: пазнаваўчую – пазнанне асноўных аспектаў рэчаіснасці; светапоглядную – фарміраванне светапогляду; сэнсастваральную – наданне сэнсу чалавечаму жыццю і развіццю грамадства; рэгулятыўную – выпрацоўка прынцыпаў паводзін; пераўтвараючую – распрацоўка прынцыпаў пераўтварэння рэчаіснасці; прагнастычную – пабудова сцэнарыяў будучага; метадалагічную – выпрацоўка метадаў дзейнасці і пазнання; гуманістычную – фарміраванне ўнутранага свету чалавека.

**Канцэпцыі ўзнікнення філасофіі.** Ёсць дзве канцэпцыі ўзнікнення філасофіі:

1. Яна ўзнікла ў 6 ст. да н. э. у трох не звязаных паміж сабой рэгіёнах Зямлі: Старажытнай Індыі, Старажытным Кітаі і Старажытнай Грэцыі.

2. Філасофія – прадукт еўрапейскай культуры. Узнікла ў 6 ст. да н. э. у Старажытнай Грэцыі.

Вылучаюць наступныя прадумовы ўзнікнення філасофіі: міфалагічныя, гнасеалагічныя і сацыяльныя.

**Фактары развіцця філасофіі** – тыя абставіны, якія абумоўліваюць характар філасофскіх вучэнняў. Умоўна можна вылучыць два віда фактараў:

1. Знешнія фактары. Філасофія з'яўляецца выражэннем асноўных тэндэнцый культуры сваёй эпохі і вызначаецца імі. Напрыклад, культура сярэдніх вякоў мела пераважна рэлігійны характар. Культура Новага часу грунтавалася на навуковым разуменні свету. Гэта адлюстравалася і на філасофскай праблематыцы.

2. Унутраныя фактары. Для філасофскага развіцця характэрна пераемнасць. Напрыклад, вучэнне Сакрата склалася ў палеміцы з сафістамі, Платон даў сваё тлумачэнне ўзнятых Сакратам праблем,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Арыстоцель палемізаваў з Платонам. Такім чынам, можна казаць аб адзінай філасофскай традыцыі і пераемнасці паміж вучэннямі.

**Светапогляд** – сукупнасць прынцыпаў, поглядаў, перакананняў, якія вызначаюць напрамкі дзейнасці і адносіны да рэчаіснасці асобнага чалавека, сацыяльнай групы, класа або грамадства ў цэлым. Светапогляд складаецца з філасофскіх, навуковых, палітычных, прававых, рэлігійных, маральных і эстэтычных поглядаў. Філасофскія погляды і перакананні складаюць частку ўсёй сістэмы светапогляду. У некаторых выпадках яны з'яўляюцца асновай гэтай сістэмы. У іншых – светапогляд грунтуецца на палажэннях міфалогіі, рэлігіі, навукі, мастацтва альбо штодзённых уяўленнях. Вылучаюць наступныя віды светапогляду: штодзённы– успрыманне і тлумачэнне рэчаіснасці праз непасрэдны жыццёвы вопыт, міфалагічны – успрыманне і тлумачэнне рэчаіснасці пры дапамозе наглядных вобразаў, рэлігійны – успрыманне і тлумачэнне рэчаіснасці праз звышнатуральнае, філасофскі – успрыманне і тлумачэнне рэчаіснасці праз яе асноўныя аспекты, навуковы – тлумачэнне рэчаіснасці праз выяўленне яе заканамернасцей, мастацкі светапогляд – успрыманне рэчаіснасці праз наглядныя вобразы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ФІЛАСОФІЯ БЫЦЦЯ

**Анталогія** (ад грэч. *ontos* – ʻбыццёʼ, *logos* – ʻсловаʼ) – вучэнне аб быцці, незалежным ад яго разнавіднасцяў. Тэрмін упершыню з’явіўся ў “Філасофскім лексіконе” Р. Гакленіуса (1613) для падкрэслення толькі быццёвага зместу “метафізікі”, якая ў шэрагу трактовак захоўвала розныя элементы гнасеалогіі. У далейшым ужыванні ў 18 ст. тэрміны “анталогія” і “метафізіка” нярэдка перасякаліся, але да сярэдзіны 19 ст. яны разыходзяцца у сувязі з дэзактуалізацыяй паняцця “метафізіка”.

**Метафізіка** (ад грэч. *ta meta ta physica* – ʻтое, што ідзе пасля фізікіʼ) – вучэнне аб першапачатках быцця. Тэрмін з’явіўся пры першым (рукапісным) выданні твораў Арыстоцеля Андронікам Радоскім у 1 ст. да н. э. як назва тых, якія сам аўтар называў сачыненнямі па “першай філасофіі”. У гэтым сэнсе тэрмін “метафізіка” ужываўся ў далейшым. У Новы час узнікае разуменне метафізікі як “антыдыялектыкі”, як вынік аднабаковасці ў пазнанні, калі рэчы і з’явы разглядаюцца як нязменныя і незалежныя адна ад адной, калі адмаўляюцца ўнутраныя супярэчнасці ў якасці крыніцы развіцця ў прыродзе, грамадстве і мысленні. Упершыню тэрмін “метафізіка” ў сэнсе “антыдыялектыкі” ужыў Гегель, далейшае ўжыванне і развіццё ён атрымаў у дыялектычным матэрыялізме, які мяркуе, што метафізічны характар носіць абсалютызацыя любых бакоў і момантаў пазнавальнага працэсу. Антыметафізічную накіраванасць набылі таксама многія напрамкі філасофіі 19–20 стст. (пазітывізм, прагматызм, неакантыянства і, асабліва, постмадэрнізм), якія называюць “метафізікай” спекулятыўную рацыяналістычную філасофію, якая ставіць у цэнтр увагі анталагічныя пытанні.

**Быццё** (ад грэч. *ousia*; лац. *esse*) – філасофская катэгорыя, якая абазначае наяўнасць чаго-небудзь, а таксама характар гэтай наяўнасці. Вылучаюць маністычную, дуалістычную і плюралістычную канцэпцыі быцця.

**Манізм** (ад грэч. *monos* – ʻадзін, адзіныʼ) – філасофскае вучэнне, якое прымае за аснову ўсяго існуючага адзін пачатак. Матэрыялісты пачаткам, асновай свету лічаць матэрыю; ідэалісты – дух, ідэю і г. д.

**Дуалізм** (ад лац. *dualis* – ʻдваістыʼ) – філасофскае вучэнне, якое зыходзіць з прызнання двух незалежных і раўнапраўных пачаткаў (прынцыпаў), якія складаюць фундаментальную аснову свету і чалавечага быцця. Вядзе пачатак ад супрацьпастаўлення Арыстоцелем пасіўнай матэрыі і актыўнай формы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Плюралізм** (ад лац. *pluralis* – ‛множны’) – анталагічная пазіцыя, якая прызнае некалькі розных відаў быцця: быццё аб’ектаў неарганічнай прыроды, быццё аб’ектаў арганічнай прыроды, быццё чалавека, быццё аб’ектаў матэрыяльнай культуры, быццё аб’ектаў духоўнай культуры, быццё ўнутранага свету чалавека, віртуальнае быццё, сацыяльнае быццё.

**Ідэалізм** (фр. *idealisme*, ад грэч. *idea* – ‛выгляд, форма, правоб-раз’) – напрамак у філасофіі, які зыходзіць з першаснасці духоўнага, разумовага, псіхічнага і другаснасці матэрыяльнага, прыроднага, фізічнага. Асноўныя формы ідэалізму – аб’ектыўны і суб’ектыўны ідэалізм. Першы за першааснову існага прымае безасабовы універсальны дух. Другі адмаўляе якую-небудзь рэальнасць па-за індывідам: рэальнасць сутнасць плод яго духоўнай творчасці. Тэрмін *“ідэаліст”* упершыню быў выкарыстаны Лейбніцам у 1702 г., які супрацьпаставіў “найвялікшага ідэаліста” Платона “найвялікшаму матэрыялісту” Эпікуру. Аднак гістарычна першым ідэалістычным вучэннем варта прызнаць піфагарызм, які лічыў першаасновай быцця рэчаў бесцялесныя пачаткі: лічбу, мяжу і бязмежнае. У 19 ст. нямецкі філосаф Ф. Трэндэленбург ажыццявіў падзел ўсёй філасофіі на два напрамкі: ідэалізм і матэрыялізм. Гэты падыход быў запазычаны адным з класікаў марксізму Ф. Энгельсам і ў савецкія часы меў афіцыйны характер.

**Дух** – паняцце, якое выказвае ідэальны пачатак, ад якога выходзіць творчая сіла, якая здзейсняе і падымае чалавека і свет да абсалютнага і безумоўна каштоўнага. У Новы час нарастае тэндэнцыя да разумення духу як усеагульначалавечага асобаснага пачатку. Зараз пад духам разумеецца тое, што ўказвае на дачыненне чалавека сферы універсальных сэнсаў і вышэйшых каштоўнасцяў, увасобленых у рэлігіі, філасофіі, маралі, мастацтве, навуцы.

**Ідэя** (ад грэч. *idea* – ‛выгляд, форма; правобраз’) у шырокім сэнсе – разумовы правобраз якога-небудзь дзеяння, прадмета, з’явы, прынцыпу, які вылучае яго асноўныя, галоўныя і істотныя рысы. У шэрагу філасофскіх канцэпцый – нязменны і спрадвечны правобраз рэчаіснасці. У філасофіі 20 ст. тэрмін “ідэя” губляе самастойнае значэнне і выкарыстоўваецца толькі як сінонім тэрміна “паняцце”.

**Матэрыялізм** (ад лац. *materialis* – ‛рэчыўны’) – філасофскі напрамак, які прызнае аб’ектыўнасць, першаснасць, неўтваральнасць і незнішчальнасць матэрыі, якая існуе па-за і незалежна ад свядомасці і выступае першаасновай рэчаіснасці. Вылучаюць наступныя віды матэрыялізму:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– наіўны (стыхійны) матэрыялізм (Лаацзы, Ян Чжу, Ван Чун, школа лакаята, Геракліт, Анаксагор, Эмпедокл, Дэмакрыт, Эпікур і інш.) Да дадзенага тыпу матэрыялізму прымыкае прыродазнаўчы матэрыялізм, заснаваны на дадзеных канкрэтных навук;

– вульгарны матэрыялізм (Фогт, Бюхнер, Малешотт) ігнаруе сацыяльна-гістарычную прыроду свядомасці, тлумачачы апошняе як непасрэдную ўласцівасць мозгу;

– антрапалагічны матэрыялізм (Л. Феербах, Н. Г. Чарнышэўскі), дыялектычны матэрыялізм (К. Маркс і Ф. Энгельс).

**Матэрыя** (ад лац. *materia* – літар. ʽдраўнінаʼ, хоць часцей перакладаюць як *рэчыва*) – філасофская катэгорыя, якая разумеецца рознымі аўтарамі як 1) рэчыва, з якога будуюцца ўсе рэчы (субстратная трактоўка); 2) сукупнасць уласцівасцяў (працягласці, масы, непранікальнасці, інэртнасці і т. д.), уласцівых усім пачуццёва-ўспрыманым рэчам (атрыбутыўная трактоўка); 3) аб'ектыўная рэальнасць, дадзеная нам у адчуваннях, – тое, што супрацьстаіць свядомасці (гнасеалагічная трактоўка). Адмысловую значнасць гэтае паняцце набыло ў дыялектычным матэрыялізме, паводле якога матэрыя – аб'ектыўная рэальнасць, якая існуе па-за і незалежна ад чалавечай свядомасці і адлюстроўваецца ёй.

**Субстанцыя** (ад лац. *substantia* – ʽтое, што ляжыць у аснове') – рэчаіснасць, што існуе самастойна, застаецца самой сабой пры зменах і з'яўляецца асновай іншых рэчаіснасцяў, якія ў сваім існаванні ад яго залежаць.

**Субстрат** (ад позналац. *substratum* – ʽаснова, падмурак') – агульная аснова і "будаўнічы матэрыял" для разнастайных з'яў. Дадзенае паняцце нярэдка выкарыстоўваецца як сінонім субстанцыі. Адрозненне паміж імі заключаецца ў тым, што субстанцыя – тое, з чаго ўсё паходзіць, субстрат – тое, з чаго ўсё складаецца.

**Прастора і час** – катэгорыі, якія адлюстроўваюць множны характар існага, працягласць і ўзаемнае размяшчэнне розных аб'ектаў. У філасофіі былі розныя трактоўкі прасторы і часу: як форм індывідуальнай свядомасці (Берклі, Юм, Мах), як апрыёрных форм пачуццёвага сузірання (Кант), як катэгорый абсалютнага духу (Гегель), як форм існавання матэрыі (марксізм). **Прастора** – катэгорыя, якая адлюстроўвае ўзаемнае размяшчэнне аб'ектаў і іх памеры. **Час** – катэгорыя, якая паказвае працягласць і паслядоўнасць існавання з'яў, тэмп і рытм тых працэсаў, у якіх яны ўдзельнічаюць. Існуюць субстанцыянальная і рэлятыўная канцэпцыі прасторы і часу. Згодна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з першай (Дэмакрыт, Ньютон), прастора і час існуюць самі па сабе, незалежна ад аб'ектаў і працэсаў, згодна з другой (Арыстоцель, Лейбніц), прастора ўтвараецца аб'ектамі, а час – працэсамі. Пасля стварэння Эйнштэйнам тэорыі адноснасці большасць даследчыкаў прытрымліваюцца субстанцыянальнай канцэпцыі прасторы і часу.

Узорам для нас з'яўляюцца прастора і час класічнай фізікі. Прастора тут аднародная і мае тры вымярэнні, час аднародны і мае адно вымярэнне. Час незваротны, гэта значыць, што ўсякі фізічны працэс развіваецца ў адным кірунку – ад мінулага да будучага. Апроч фізічных ёсць яшчэ біялагічныя і сацыяльныя прастора і час. Біялагічная прастора ўтвараецца арганізмамі і ўзаемадзеяннем паміж імі (біяцэноз, біясфера). Біялагічны час ўтвараецца працэсамі, якія адбываюцца ў біялагічнай прасторы. Сацыяльная прастора ўтвараецца ўзаемадзеяннем паміж індывідамі, сацыяльнымі інстытутамі і групамі, сацыяльны час – працэсамі, якія адбываюцца ў грамадстве. Вылучаюць таксама рэальную і перцэптуальную прастору і час. Першыя характарызуюць рэчаіснасць, другія – яе ўспрыманне.

**Рух** – любая змена аб'ектаў і працэсаў, усякае ўзаемадзеянне аб'ектаў і змена іх станаў. У матэрыялізме прызнаюцца розныя тыпы і формы руху. Тыпы руху: колькасны (перамяшчэнне цел) і якасны. Апошні тып уключае ў сябе наступныя віды: функцыянаванне, кругазвароты, развіццё. Формы руху: механічны, фізічны, хімічны, біялагічны, сацыяльны (многія навукоўцы прызнаюць, што самастойнымі формамі з'яўляюцца таксама геалагічны, планетарны, кампутарны і інш.).

**Развіццё** – змена аб'ектаў і працэсаў, якая мае заканамерны, накіраваны, незваротны, якасны характар. Гэта вынікае з трактоўкі часу як лінейнага і аднанакіраванага. У старажытнай філасофіі не існавала паняцці развіцця як такога, і гэта было абумоўлена цыклічным разуменнем часу. З фарміраваннем канцэпцыі лінейнага часу, што было звязана з хрысціянскім светапоглядам, ўзнікла і паняцце развіцця, якое стала набываць усё большае значэнне пры асэнсаванні рэчаіснасці. У 19 ст., у сувязі са стварэннем тэорыі эвалюцыі Ч. Дарвінам, ідэя развіцця стала дамінуючай ў еўрапейскай культуры і потым стала распаўсюджвацца па ўсім свеце. У 20 ст. асноўная ўвага надаецца высвятленню механізмаў развіцця ў прыродзе, грамадстве, жыцці чалавека і г. д.

**Прагрэс** (ад лац. *progressus* – 'рух наперад, поспех') – тып, напрамак развіцця, якое характарызуецца пераходам ад ніжэйшага да вышэйшага, ад менш да больш дасканалага. Аб прагрэсе можна казаць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у дачыненні да сістэмы ў цэлым, да асобных яе элементаў, да структуры і інш. Існуюць самыя розныя крытэрыі прагрэсу. Прагрэсіўна ў цэлым развіваецца тэхніка. Але ў галіне мастацтва і маралі прагрэс не з'яўляецца настолькі відавочным. Паняцце прагрэсу суадносна з паняццем рэгрэсу.

**Рэгрэс** (ад лац. *regressus* – ʽзваротны рух') – тып развіцця, для якога характэрны пераход ад вышэйшага да ніжэйшага стану. Змест рэгрэсу складаюць працэсы дэградацыі, паніжэнні ўзроўню арганізацыі, страты здольнасці да выканання тых ці іншых неабходных функцый. Рэгрэс уключае таксама моманты застою, звароту да зжылых сябе формаў і структур.

**Эвалюцыя** (ад лац. *evolutio* – ʽразгортванне') – форма развіцця, звязаная з паступовымі колькаснымі зменамі або са зменай якасцяў, у цэлым не разбураючых адзінства і пэўнасць сістэм і структур.

**Рэвалюцыя** (ад познелац. *revolutio* – ʽпаварот, пераварот') – радыкальнае змяненне ў развіцці, якое прыводзіць да ўзнікнення новага стану (напрыклад, геалагічная рэвалюцыя, прамысловая рэвалюцыя, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, культурная рэвалюцыя). Найбольш шырока паняцце "рэвалюцыя" ужываецца ў сацыяльных тэорыях.

**Дыялектыка** (ад грэч. *dialegomai* – ʽвяду гутарку, разважаю') – філасофскае вучэнне аб развіцці. Крыніцай развіцця і ўзаемасувязі ў свеце лічыцца барацьба супрацьлеглых пачаткаў альбо аспектаў рэчаіснасці.

**Прырода** (грэч. *physis*, ад *phyein* – ʽузнікнуць, быць народжаным'; лац. *natura*, ад *nasci* – ʽтое ж самае') – паняцце, якое ў розных аўтараў і ў розных кантэкстах можа азначаць: 1) сутнасць чаго-небудзь (прырода чалавека, прырода грамадства і г. д.), 2) увесь матэрыяльны свет, Універсум, 3) натуральнае асяроддзе, сукупнасць натуральных умоў існавання чалавека. Зараз вылучаюць натуральную і створаную прыроду. Першая – тое асяроддзе, якое існуе да чалавека і незалежна ад чалавека. Другая – асяроддзе, створанае чалавекам, матэрыяльная культура. Суаднясенне натуральнай і створанай прыроды – адзін з аспектаў сучаснай экалагічнай праблематыкі.

**Экалогія** (ад ст.-грэч. *oikos* – ʽжыллё, месцазнаходжанне' і *logos* – ʽвучэнне') – навука аб узаемадзеяннях жывых арганізмаў паміж сабой і з іх асяроддзем. Тэрмін у 1866 г. прапанаваў нямецкі біёлаг Э. Г. Геккель. У наш час пад экалагічнымі праблемамі разумеюцца пытанні аховы навакольнага асяроддзя.

**Біясфера** (ад грэч. *bios* – ʽжыццё' і *sphaira* – ʽсфера, вобласць') – зямная абалонка, якая складаецца з атмасферы, гідрасферы і верхняй

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

частцы літасферы, дзе працякае жыццё. Біясфера ўзнікла 3,5–4,5 млрд. гадоў таму і характарызуецца якасна новым станам зямной паверхні, які яна набыла ў выніку працяглага ўзаемадзеяння жывой і нежывой матэрыі.

**Наасфера** (ад грэч. *noos* – ʽрозум’, літаральна – ʽсфера розуму’) – паняцце, якое азначае (у вучэнні В. Вярнадскага) вышэйшы этап у развіцці біясферы, пры якім уся прырода нашай планеты пераходзіць пад разумнае і планамернае кіраванне людзьмі.

**Каэвалюцыя** (ад *са-* – прыстаўка, якая азначае шэраг умоў ʽсумеснасць, узгодненасць’; лац. *evolutio* – ʽразгортванне’) – сумесная эвалюцыя біялагічных відаў, якія ўзаемадзейнічаюць у экасістэме. Змены, якія закранаюць якія-небудзь рысы аднаго віду, прыводзяць да змен у іншага або іншых відаў. Варта адзначыць, што ў сувязі с тым, што экасістэмы фармуюць сетку міжвідавага ўзаемадзеяння, то ўсе віды, якія ўваходзяць у экасістэму, павінны каэвалюцыянаваць.

**Сінергетыка** (ад грэч. *synergeia* – ʽсупрацоўніцтва, садзейнічанне, саўдзел’) – міждысцыплінарны напрамак навуковых даследаванняў, у рамках якога вывучаюцца заканамернасці працэсаў самаарганізацыі і самаадвольнай дэзарганізацыі ў сістэмах рознай прыроды (фізічнай, хімічнай, біялагічнай, сацыяльнай і г. д.).

**Глабальны эвалюцыянізм** - канцэпцыя, якая разглядае Сусвет як адну вялікую сістэму, якая бесперапынна эвалюцыянуе; з’яўляецца важнай часткай сучаснай навуковай карціны свету.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ФІЛАСОФСКАЯ АНТРАПАЛОГІЯ

**Антрапагенез** (грэч. *anthropos* – ʻчалавекʼ і *genesis* – ʻпаходжаннеʼ) – працэс узнікнення і развіцця чалавека сучаснага тыпу (Homo sapiens).

**Антрапасацыягенез** (лац. *societas* – ʻграмадстваʼ) – адзіны працэс узнікнення чалавека і чалавечага грамадства.

**Антрапамарфізм** – перанясенне уласцівых чалавеку якасцей і асаблівасцей на знешнія сілы прыроды, надзяленне багоў рысамі чалавека. Характэрны для большасці міфалогій, у тым ліку і для беларускай.

**Антрапацэнтрызм** – прынцып, паводле якога чалавек ёсць цэнтр свету. Найбольш яскрава праявіўся ў культуры Адраджэння.

**Гуманізм** (ад лац. *humanus* – ʻчалавечы, чалавечныʼ). Паняцце гуманізму з’яўляецца ў пачатку 19 ст. для абазначэння плыні грамадскай думкі, якая ўзнікла ў эпоху Адраджэння. У вузкім сэнсе гуманізм Адраджэння разглядаўся як культурная і педагагічная праграма, звязаная са звяртаннем да дысцыплін, якія знаходзіліся па-за межамі схаластычнай вучонасці (да рыторыкі, граматыкі, тэорыі паэзіі, гісторыі і г. д.). У больш шырокім сэнсе гуманізм эпохі Адраджэння – гэта новы спосаб мыслення, звязаны са зменай погляду на месца чалавека ў свеце, на межы і магчымасці яго актыўнасці ў сферы навукі, мастацтва, маралі і палітычнага жыцця. У шырокім сэнсе паняцце “Гуманізм” выкарыстоўваецца для характарыстыкі сацыяльна-філасофскіх поглядаў і накіраванасці грамадска-палітычных сістэм у цэлым. Гуманізм – светапогляд, які прызнае чалавека ў якасці вышэйшай каштоўнасці.

**Чалавек** – прадстаўнік віда homo sapiens (чалавек разумны), узяты ў адзінстве яго біялагічных, сацыяльных і асабовасных рысаў. Адно з цэнтральных філасофскіх паняццяў, ад інтэрпрэтацыі зместу якога залежыць пазнавальная, сацыяльная, каштоўнасная арыентацыя любой філасофскай сістэмы. Цяжкасць вызначэння дадзенай катэгорыі звязана з тым, што “чалавечнасць” ёсць адначасова і асобасна-арыентацыйная, і філасофска-тэарэтычная праблема. Асобасна-арыентаваную праблему чалавека можна сфармуляваць наступным чынам: “чалавек ёсць пастаянная праблема для самога сябе”. Філасофска-тэарэтычны змест катэгорыі “чалавек” патрабуе высвятлення адносіны чалавека да самога сябе, да іншых людзей, да грамадства ў цэлым, да прыроды, да Бога. Паколькі вывучэнне чалавека неаддзельна ад вывучэння ўсяго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

комплексу сувязяў чалавека і свету, пастолькі праблема чалавека аказваецца адной з цэнтральных філасофскіх праблем, якая па-рознаму вырашаецца ў розных філасофскіх накірунках.

Вылучаюць наступныя трактоўкі чалавека:

– тэалагічная (грэч. *theos* – ʽбог’) – чалавек з’яўляецца стварэннем звышнатуральных сіл;

– рацыяналістычная (лац. *ratio* – ʽрозум’) – спецыфіка чалавека ў тым, што ён разумная істота;

– натуралізатарская (лац. *natura* – ʽпрырода’) – чалавек з’яўляецца прыроднай істотай, вышэйшым этапам ў развіцці жывёл;

– сацыялагізатарская (лац. *socius* – ʽагульны, сумесны’) – чалавек з’яўляецца прадуктам грамадскіх адносін;

– персаналістычная (лац. *persona* – ʽасоба’) – кожны чалавек уяўляе сабой непаўторную асобу.

Гэтыя трактоўкі ўзаемадапаўнальныя. Безумоўна, чалавек з’яўляецца разумнай істотай. З пункту погляду біялогіі ён – арганізам, з пункту погляду сацыялогіі – індывід, з пункту погляду сучаснай філасофіі – асоба.

**Розум** – гэта вышэйшы ўзровень мыслення, які прадугледжвае творчае аперыраванне абстракцыямі і выкарыстанне дыялектычнай логікі.

**Арганізм** (познелац. *organismus* ад познелац. *organizo* – ʽуладкоўваю, паведамляю стройны выгляд’) – жывое цела, якое валодае сукупнасцю ўласцівасцяў, якія адрозніваюць яго ад нежывой матэрыі, у тым ліку абменам рэчываў, самападтрымліваннем сваёй будовы і арганізацыі, здольнасцю ўзнаўляць іх пры размнажэнні, захоўваючы спадчынныя прыкметы. Тэрмін арганізм уведзены Арыстоцелем. Ён выявіў, што любая жывая істота характарызуецца дакладнай і строгай арганізацыяй, у адрозненне ад нежывога.

**Індывід** (ад лац. *individuum* – ʽнепадзельнае’) – паняцце, якое пазначае чалавека ў якасці асобнага прадстаўніка чалавечага роду.

**Індывідуальнасць** – сукупнасць унікальных уласцівасцяў, якія адрозніваюць аднаго індывіда ад іншых.

**Асоба** – канкрэтны чалавек, які характарызуецца з боку яго цэласнасці, свядома-валявых праяў. Першапачаткова слова “асоба” (лац. *persona*) азначала маску, ролю, якая выконвалася акцёрам у антычным тэатры. У адрозненне ад паняцця індывіда, якое вызначаецца як адасабленне ў рамках адзінства, сэнсавое поле паняцці асобы – гэта праява ўнутранага ў вонкавым. Сэнс паняцця асобы раскрываецца праз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паняцце свабоды, адказнасці, учынку як дзеянні адпаведна свабодна прынятаму рашэнню; самасвядомасці і самаразвіцця.

**Свабода** – магчымасць і здольнасць чалавека самому вызначаць мэты, сродкі і ход сваёй дзейнасці.

**Фаталізм** (ад лац. *fatalis* – ʻвызначаны лёсамʼ) – уяўленне аб непазбежнасці ўсяго, што адбываецца ў прыродзе, грамадстве і жыцці чалавека, светапоглядная пазіцыя, якая адмаўляе выпадковасць і свабоду.

**Трансгуманізм** (ад лац. *trans* – ʻскрозь, праз, заʼ і *homo* – ʻчалавекʼ) – філасофская канцэпцыя, а таксама міжнародны рух, якія ставяць за мэту пераадолець чалавека, стварыўшы на яго аснове прынцыпова новую, больш дасканалую істоту.

**Дзейнасць** – спецыфічна чалавечая форма актыўнага стаўлення да свету і самога сябе, заснаваная на іх мэтазгодным пераўтварэнні. Дзейнасць носіць свядомы характар; яна ўключае ў сябе мэту, сродак, вынік і сам працэс дзейнасці. Прынцып дзейнасці ў філасофіі сфармуляваны антычнымі мысліўцамі. Увасабленнем дзейнаснага чалавечага пачатку з'яўляецца Бог – Дэміург Платона, які стварыў космас. Філосафы эпохі Адраджэння з дзейнасцю, а таксама свабодай, якая пры гэтым дасягаецца, звязвалі разуменне сутнасці чалавека. Адным з вядучых прынцыпаў дзейнасці з'яўляецца ў нямецкай класічнай філасофіі: марксісцкая філасофія дае новую трактоўку дзейнасці, уводзячы паняцце практыкі як асновы існавання і развіцця грамадства і чалавека. Вылучаюць наступныя віды дзейнасці: матэрыяльна-практычная (пераўтварэнне прыроды і грамадства) і духоўная (развіццё пазнання, у тым ліку навуковага, мастацкага, маральнага, філасофскага, рэлігійнага). Дзейнасць можа быць сацыяльна-групавой і індывідуальнай. Па характары пераўтварэнняў вылучаюць рэпрадуктыўную (якая адбываецца па ўжо распрацаваным схемам) і творчую (якая накіравана на стварэнне новага) тыпы дзейнасці.

**Сацыялізацыя** – працэс засваення чалавекам пэўных праграм дзейнасці і паводзін, якія характэрны для таго ці іншага грамадства і спалучанай з ім культуры.

**Камунікацыя** – 1) працэс абмену інфармацыяй (шырокі сэнс), 2) непасрэдныя міжасобасныя зносіны, заснаваныя на дыскусіі і пошуку ўзаемаразумення (вузкі сэнс).

**Жыццё** – шматзначнае паняцце, якое мае некалькі сэнсаў:

– натуральна-навуковы, біялагічны,
– метафізічны (лёс чалавека),

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– гісторыка-культурны,
– біяграфічны.

У агульным плане жыццё – асаблівы спосаб быцця арганізмаў, істотнымі бакамі якога з'яўляюцца абмен рэчываў з навакольным асяроддзем і ўзнаўленне сабе падобных.

**Сэнс жыцця** – вышэйшая мэта чалавечага быцця, якая служыць арыентырам для дзейнасці. Адно з асноўных светапоглядных паняццяў, звязанае з імкненнем чалавека зразумець сваё прызначэнне ў свеце і апраўдаць уласнае жыццё перад абліччам няўхільна надыходзячай смерці. Можа быць трактаваны самым розным чынам: дасягненне нірваны (будызм), выкананне абавязку (канфуцыянства), жыццё ў адпаведнасці з дао (даасізм), дасягненне шчасця (эпікурэйства), выратаванне душы (хрысціянства), барацьба за пабудову справядлівага грамадства (марксізм) і г. д. Разуменне сэнсу жыцця вызначае характар асобы. Звычайна чалавеку цяжка сфармуляваць сэнс свайго жыцця, але адчуванне яго страты робіць чалавека нежыццяздольным, адным з вынікаў гэтага з'яўляецца імкненне да суіцыду.

**Канфармізм** (лац. – *conformis* – 'падобны') – паняцце, якое абазначае прыстасаванства, пасіўнае прыняцце існуючага парадку рэчаў, якія пануюць меркавання і г. д. Канфармізм ёсць адсутнасць уласнай пазіцыі, беспрынцыповае і некрытычнае прытрымліванне любога ўзору, які валодае найбольшай сілай ціску (меркаванне большасці, прызнаны аўтарытэт, традыцыя і т. п.).

**Утылітарызм** (лац. *utilis* – 'карысны') – кірунак у этыцы (этычная тэорыя), паводле якога маральная каштоўнасць паводзін ці ўчынку вызначаецца яго карыснасцю. Пад карыснасцю ўчынку маецца на ўвазе інтэгральнае задавальненне ці шчасце, атрыманае ўсімі, максімальнае дабро для максімальнай колькасці людзей. У аснове ўтылітарызму ляжаць геданізм або эўдэманізм. 2. Маральная пазіцыя, калі паводзіны накіраваныя на дасягненне карысці. Заснаваны на эгаізме.

**Эгаізм** (лац. *ego* – 'я') – жыццёвая пазіцыя, заснаваная на імкненні дасягнуць выключна асабістыя інтарэсы. Адкрыты эгаізм выклікае непрыняцце іншых людзей. Але чалавек можа быць альтруістам з тых меркаванняў, што гэта яму выгадна.

**Альтруізм** (лац. *alter* – 'другі, іншы') – жыццёвая пазіцыя, заснаваная на праяве клопату аб іншых, імкненні прынесці ім карысць, нават за конт уласных інтарэсаў.

**Аскетызм** (ад грэч. *askeo* – 'той, хто практыкуецца, падзвіжнік') – метад маральнага ўдасканалення і духоўнага ўзвышэння чалавека праз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэгуляцыю ім сваіх цялесных і душэўных памкненняў, а таксама адпаведная практыка, уласна аскеза. Як маральны прынцып аскетызм супрацьлеглы геданізму.

**Геданізм** (грэч. *hedone* – ‘асалода’) – прынцып абгрунтавання маральных патрабаванняў, паводле якога дабро вызначаецца як тое, што прыносіць асалоду і збавенне ад пакут, а зло – як тое, што цягне за сабой пакуты.

**Эўдэманізм** (грэч. *eudaimonia* – ‘шчасце’) – прынцып жыццяразумення, па якім шчасце з’яўляюцца найвышэйшай мэтай чалавечага жыцця. Для эўдэманістаў шчасце – гэта вынік пераадолення імкнення да пачуццёвым асалодам шляхам самаабмежавання, аскезы, адмовы ад даброт знешняга свету. Найбольш развітой формы геданізм дасягнуў у вучэнні Эпікура.

**Смерць** – завяршальны момант існавання арганізму. У шэрагу філасофскіх кірункаў лічыцца, што для чалавека перажыванне смерці выступае як вызначальны момант яго светапогляду. Трактоўка смерці з’яўляецца важным кампанентам любой сацыяльна-культурнай сістэмы і суправаджае гістарычны працэс станаўленні асобы.

**Свядомасць** – спосаб ўспрымання і ўзаемадзеяння чалавека з рэчаіснасцю, які характарызуецца накіраванасцю, абстрактнасцю, моўным мысленнем і самасвядомасцю. Свядомасць выступае ў двух формах: індывідуальнай і грамадскай. Свядомасць унутрана звязана з несвядомым.

**Несвядомае** – асаблівая вобласць псіхікі, якая засяродзіла ў сабе вечныя імкненні, матывы, сэнс якіх вызначаецца інстынктамі і недаступны свядомасці. Найбольш поўнае развіццё дадзенае ўяўленне аб несвядомым атрымала ў фрэйдызме.

**Мова** – сістэма знакаў, якія маюць значэння. Мова выконвае функцыі: інфарматыўную, камунікатыўную, акумуляцыйную. Мова – спосаб істоты знайсці свядомасці і ажыццявіць узаемаадносіны паміж людзьмі з дапамогай членападзельных галасавых гукаў, пісьмовых знакаў і г. д., надзеленых жыццёва значнай сукупнасцю сэнсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭОРЫЯ ПАЗНАННЯ І ФІЛАСОФІЯ НАВУКІ

**Гнасеалогія** (ад грэч. *gnosis* – ‘пазнанне’ і *logos* – ‘вучэнне’) – раздзел філасофіі, у якой разглядаюцца пытанні аб сутнасці пазнання, аб шляхах пасціжэння ісціны, яе асновах і крытэрах.

**Эпістэмалогія** (грэч. *episteme* – ‘пазнанне’ і *logos* – ‘вучэнне’) – раздзел філасофіі, у якім аналізуецца навуковае пазнанне.

**Пазнанне** – філасофская катэгорыя, якая апісвае працэс пабудовы ідэальных планаў дзейнасці і зносін, стварэння знакава-сімвалічных сістэм, якія апасродкуюць узаемадзеянне чалавека са светам і іншымі людзьмі.

**Ісціна** – філасофская катэгорыя, якая абазначае канчатковы ідэал пазнання. Існуюць розныя яе трактоўкі. Так, паводле класічнай канцэпцыі ісціны, сапраўднай з’яўляецца тая думка, якая адпавядае свайму прадмету.

**Аб’ектыўная ісціна** - незалежны ад чалавека і чалавецтва змест ведаў. Па форме ісціна суб’ектыўная – гэта ўласцівасць чалавечых ведаў. Па зместу ісціна аб’ектыўная, бо не залежыць ад свядомасці, а абумоўлена адлюстраваннем ў ім матэрыяльнага света.

**Гнасеалагічны аптымізм** – гнасеалагічная пазіцыя, якая выходзіць з прынцыповай пазнавальнасці рэчаіснасці і прагрэсіўнага развіцця пазнання.

**Скептыцызм** (ад ст.-грэч. *scepticus* – ‘разглядаючы, які даследуе’) – філасофскі кірунак, які вылучае сумненне ў якасці прынцыпу мыслення, асабліва сумнеў у надзейнасці ісціны. Скептыцызм не разглядае сумненне як прынцып, а выкарыстоўвае як палемічную зброю супраць дагматыкаў; прынцып скептыцызму – з’ява.

**Агнастыцызм** (ад грэч. а- – адмоўная прыстаўка, *gnosis* – ‘веды’, *agnostos* – ‘недаступны пазнанню’) – філасофскае вучэнне, якое сцвярджае непазнальнасць свету. Тэрмін “агнастыцызм” быў уведзены ў 1869 г. англійскай прыродазнаўцам Т. Гекслі, аднак сумневы ў здольнасці чалавека пазнаць навакольныя рэчы былі выяўлены ўжо антычнымі сафістамі і скептыкамі. Найбуйнейшымі прадстаўнікамі агнастыцызму ў філасофіі Новага часу лічацца Д. Юм і І. Кант.

**Рацыяналізм** (лац. *ratio* – ‘розум’) – філасофскі напрамак, які сцвярджае розум у якасці асновы пазнання і паводзін людзей; у гнасеалогіі супрацьстаіць ірацыяналізму і сенсуалізму. Рацыяналістамі былі Платон, Аўгустын, Дэкарт, Спіноза, Лейбніц, Кант, Поппер і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Эмпірызм** (ад грэч. *empiria* – ʿдосведʾ) – кірунак у філасофіі, які сцвярджае ў якасці асновы пазнання пачуццёвы досвед.

**Сенсуалізм** (лац. *sensus* – ʿпачуццёʾ) – кірунак у гнасеалогіі, паводле якога адчуванні з’яўляюцца адзінай крыніцай і падставай пэўных ведаў; гістарычна першая і найбольш распаўсюджаная форма эмпірызму.

**Ірацыяналізм** (лац. *irrationalis* – ʿнеразумныʾ) – філасофскае вучэнне, якое настойвае на абмежаванасці пазнавальных магчымасцяў розуму, мыслення і прызнаюць асноўным родам пазнання інтуіцыю, пачуццё, інстынкт і т. п.

**Навука** – гэта форма і вынік сацыяльна арганізаванай дзейнасці людзей, якая заснавана на рацыянальна-паняційным мысленні і накіравана на раскрыццё аб’ектыўных законаў існавання прыроды, грамадства і чалавека. Навукі падзяляюцца на прыродазнаўчыя, сацыяльныя, гуманітарныя і тэхнічныя.

**Функцыі навукі** – тыя ролі, якія навука выконвае ў грамадстве. Вылучаюць пазнавальную, светапоглядную, вытворчую, сацыяльную і культурную функцыі.

**Індукцыя** (лац. *inductio* – ʿнавядзеннеʾ) – адзін з тыпаў высновы і метад даследавання шляхам пераходу ад адзінкавых фактаў да агульных палажэнняў. Вялікі ўнёсак у распрацоўку пытанняў індукцыі ўнеслі Ф. Бэкан, Г. Галілей, І. Ньютан, Дж. Гершэль і Дж. С. Міль.

**Верыфікацыя** (ад лац. *verum* ʿпраўдзівыʾ + *facere* ʿрабіцьʾ) – праверка тэарэтычных палажэнняў на адпаведнасць рэальнасці пры дапамозе эксперымента.

**Фальсіфікацыя** (лац. *falsus* – ʿілжывыʾ і *facio* – ʿрабіцьʾ) – адзін са спосабаў праверкі праўдзівасці тэарэтычных сцвярджэнняў (гіпотэз і тэорый) пасродкам іх абвяржэння шляхам супастаўлення з атрыманымі ў выніку досведу эмпірычнымі дадзенымі.

**Метадалогія** – сукупнасць прыёмаў даследавання ў якой-небудзь навуцы, вучэнне аб метадзе навуковага пазнання і пераўтварэнні свету.

**Аналіз** – першая стадыя даследавання, працэдура разумовага раздзяленні прадмета, з’явы, працэсу на яго састаўныя, простыя часткі.

**Эмпірычнае і тэарэтычнае** – філасофскія і агульнанавуковыя катэгорыі, якія характарызуюць асноўныя формы і ўзроўні навуковага даследавання. Можна вылучыць некалькі структурных крытэраў, якія ляжаць у аснове гэтых узроўняў навуковага пазнання. Калі эмпірычнае пазнанне адлюстроўвае знешнія сувязі, якія з’яўляюцца ўласцівасцямі прадметаў, то тэарэтычнае пранікае ў сферу ўнутраных, істотных яго



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сувязяў. Калі эмпірычнае пазнанне выкарыстоўвае метады назірання, эксперыментавання, апісанні, то тэарэтычнае – метады абстрагавання, ідэалізацыі, мадэлявання. Калі эмпірычнае пазнанне выказвае свае вынікі ў агульных уяўленнях і асобных паняццях, то тэарэтычнае пазнанне фіксуе свой змест у форме тэорый, элементы якіх звязваюцца лагічнымі доказамі. Калі эмпірычнае спазнанне абслугоўвае існуючыя віды практыкі, вытворчасці, то тэарэтычнае пазнанне заўсёды змяшчае ў сабе прынцыпова новыя формы вытворчай і сацыяльнай актыўнасці.

**Метад** (ад грэч. *methodos* – ʽшлях, даследаванне, прасочваннеʼ) – сукупнасць правіл, прыёмаў, аперацый, пры дапамозе якіх адбываецца практычнае і тэарэтычнае засваенне прадмета. Уся разнастайнасць метадаў навуковага пазнання па традыцыі, якая бярэ свой пачатак у філасофіі Новага часу, дзеляць на дзве вялікія групы: эмпірычныя і тэарэтычныя.

Прыхільнікі эмпірычнага метаду лічылі больш абгрунтаваным даследаванне свету на падставе адчуванняў (адсюль прадстаўнікоў гэтага кірунку называлі сенсуалістамі, а вучэнне – сенсуалізмам). У ходзе правядзення цэлага шэрагу доследаў адбываецца праверка адэкватнасці адлюстравання органамі пачуццяў рэальных заканамернасцей быцця. Такім чынам, эмпірычны метад меркаваў індуктыўны вывад: спазнанне разгортвалася ад эксперыментаў (прыватнасцяў) да абагульняючых высноў (агульнага).

У сваю чаргу, рацыяналісты выкарыстоўвалі дэдукцыю. Галоўнае адрозненне іх разумення пазнавальнага працэсу заключалася ў тым, што яны не давяралі адчуванням. Яны лічылі, што органы пачуццяў, якія часам "падманваюць" свядомасць чалавека, могуць прывесці даследчыка да істотных памылак. Таму па-сапраўднаму спадзявацца можна толькі па лагічную несупярэчлівасць высноў рацыянальнага мыслення.

У выніку, усе вядомыя метады можна падзяліць на эмпірычныя (вопытныя, практычныя спосабы пазнання) і тэарэтычныя (лагічныя працэдуры).

Асновай эмпірычных метадаў з'яўляюцца пачуццёвае спазнанне (адчуванне, успрыманне, уяўленне) і дадзеныя прыбораў. Да ліку гэтых метадаў адносяцца:

– назіранне – мэтанакіраванае ўспрыманне з'яў без умяшання;

– эксперымент – вывучэнне з'яў у кантраляваных і кіраваных умовах;

– вымярэнне – вызначэнне адносіны вымяраемай велічыні да эталона (напрыклад, метра);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– параўнанне – выяўленне падабенства або адрозненні аб’ектаў або іх прыкмет.

Чыстых эмпірычных метадаў у навуковым спазнанні не бывае, бо для простага назірання неабходны папярэднія тэарэтычныя падставы – выбар аб’екта для назірання, фармуляванне гіпотэзы і г. д.

*Праблема, гіпотэза, тэорыя*

Усякае пазнанне ёсць рух ад няведання да ведаў. Такім чынам, першая ступень пазнавальнага працэсу – вызначэнне таго, што мы не ведаем. Важна дакладна і строга вызначыць праблему, аддзяліўшы тое, што мы ўжо ведаем, ад таго, што нам яшчэ невядома. Праблемай (ад грэч. *problema* – ‘задача’) называецца складанае і супярэчлівае пытанне, якое патрабуе вырашэння.

Другой ступенню ў навуковым спазнанні з’яўляецца выпрацоўка гіпотэзы (ад грэч. *hypothesis* – ‘здагадка’). Гіпотэза – гэта навукова абгрунтаваная здагадка, якая патрабуе праверкі.

Калі гіпотэза даказваецца вялікім лікам фактаў, яна становіцца тэорыяй (ад грэч. *theoria* – ‘назіранне, даследаванне’). Тэорыя – гэта сістэма ведаў, якая апісвае і тлумачыць пэўныя з’явы; такія, як, эвалюцыйная тэорыя, тэорыя адноснасці, квантавая тэорыя і інш.

Пры выбары лепшай тэорыі важную ролю гуляе магчымасць яе праверкі. Тэорыя надзейная, калі яна пацвярджаецца аб’ектыўнымі фактамі (у тым ліку нованайдзенымі) і калі яна адрозніваецца яснасцю, выразнасцю, лагічнай строгасцю. Большасць складанасцяў для навукі ўзнікае ў працэсе пераходу ад гіпотэзы да тэорыі.

Тэарэтычныя метады абапіраюцца на рацыянальнае спазнанне (паняцце, меркаванне, выснова) і лагічныя працэдуры высновы. Да ліку гэтых метадаў адносяцца:

– аналіз – працэс разумовага або рэальнага раздзялення прадмета, з’явы на часткі (прыкметы, уласцівасці, адносіны);

– сінтэз – злучэнне выдзеленых у ходзе аналізу бакоў прадмета ў адзінае цэлае;

– класіфікацыя – аб’яднанне розных аб’ектаў у групы на аснове агульных прыкмет (класіфікацыя жывёл, раслін і г. д.);

– абстрагаванне – адцягненне ў працэсе пазнання ад некаторых уласцівасцяў аб’екта з мэтай паглыбленага даследавання аднаго пэўнага яго боку (вынік абстрагавання – абстрактныя паняцці, такія, як колер, крывізна, прыгажосць і г. д.);

– фармалізацыя – адлюстраванне ведаў у знакавым, сімвалічным выглядзе (у матэматычных формулах, хімічных сімвалах і г. д.);



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– аналогія – выснова аб падабенстве аб’ектаў у пэўным стаўленні на аснове іх падабенства ў шэрагу іншых адносін;

– мадэляванне – стварэнне і вывучэнне намесніка (мадэлі) аб’екта (напрыклад, кампутарнае мадэляванне геному чалавека);

– ідэалізацыя – стварэнне паняццяў для аб’ектаў, якія не існуюць у рэчаіснасці, але маюць правобраз у ёй (геаметрычная кропка, шар, ідэальны газ);

– дэдукцыя – рух ад агульнага да прыватнага;

– індукцыя – рух ад прыватнага (фактаў) да агульнага зацвярджэння.

Тэарэтычныя метады патрабуюць эмпірычных фактаў.

**Дагматыка** – абсалютызацыя аднаго метаду як адзіна дакладнага (напрыклад, дыялектычны матэрыялізм ў савецкай філасофіі).

**Эклектыка** – некрытычнае нагрувашчванне розных незвязаных метадаў.

**Праблема** – такая форма тэарэтычных ведаў, зместам якой з’яўляецца тое, што яшчэ не спазнана чалавекам, але што патрабуецца спазнаць.

**Гіпотэза** – недаказанае праўдападобнае сцвярджэнне на аснове шэрагу назіранняў або меркаванняў, паняццяў, пастулатаў, якія пацвярджаюць яе.

**Канцэпцыя** – мадэль пацвярджэння яе праўдзівасці фактамі або без іх.

**Тэорыя** – унутрана несупярэчлівая сістэма асноўных ідэй і законаў, якая дае цэласнае ўяўленне аб істотных сувязях у разгляданым мностве аб’ектаў.

**Навуковая карціна свету** – абагульненая выява рэальнасці, атрыманая шляхам сінтэзу ведаў з розных сфер навукі.

**Парадыгма** (грэч. *paradeigma* – ‘прыклад, узор’) – сістэма тэарэтычных, аксіялагічных і метадалагічных установак, якія прыняты як кіраўніцтва да дзеяння ўсёй навуковай супольнасцю і вызначаюць аблічча “нармальнай навукі” на пэўным гістарычным этапе.

**Навуковая рэвалюцыя** – момант змены навуковых парадыгмаў. Перабудоўваецца, кардынальна змяняецца ўся даследчая стратэгія, уяўленні аб мэтах навуковай дзейнасці і спосабах іх дасягнення, змяняецца навуковая карціна свету, філасофскія ідэі і прынцыпы, якія абгрунтоўваюць мэты, метады, нормы і ідэалы навуковага даследавання. Усяго налічваецца чатыры навуковыя рэвалюцыі.

Першая адбылася ў 17 ст. Яна прывяла да ўзнікнення класічнай еўрапейскай навукі. Узнікла механіка, пазней фізіка. Сфарміраваўся навуковы тып рацыянальнасці. Ды і навука набыла сацыяльны статус.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Другая – канец 18 – першая палова 19 ст. Адбыўся пераход ад класічнай навукі, арыентаванай у асноўным на вывучэнне механічных і фізічных з’яў да дысцыплінарна арганізаванай навуцы. З’яўляюцца такія навукі, як біялогія, хімія, геалогія і інш. Механічная парадыгма перастала быць агульназначнай.

Трэцяя навуковая рэвалюцыя азначала фарміраванне новага тыпу рацыянальнасці, некласічнай навукі (канец 19 ст. – сярэдзіна 20 ст.), характарызуецца з’яўленнем некласічнага прыродазнаўства і адпаведнага яму тыпу рацыянальнасці. Рэвалюцыйныя пераўтварэнні адбыліся адразу ў шматлікіх навуках: у фізіцы з’явіліся рэлятывісцкая і квантавая тэорыі.

Чацвёртая навуковая рэвалюцыя адбылася ў апошнюю трэць 20 ст. і азначае з’яўленне постнекласічнай навукі. Дадзеная рэвалюцыя звязана са з’яўленнем асаблівых аб’ектаў даследавання, што прывяло да радыкальных змен у падставах навукі. Аб’ектамі вывучэння становяцца сістэмы, якія гістарычна развіваюцца.

**Сцыентызм** (ад лац. *scientia* – ‘веды, навука’) – пазіцыя, паводле якой навука выступае як галоўная прылада чалавечай арыентацыі ў свеце, вярхоўны суддзя пры вырашэнні любых пытанняў.

**Антысцыентызм** (лац. *scientia* – ‘веды, навука’ і грэч. *anti* – ‘супраць’) – пазіцыя, якая падвяргае крытыцы дасягнення і ролю навукі ў грамадстве.

**Этыка навукі** – сукупнасць норм паводзін, прынятых у навуковай супольнасці.

**Сацыяльная адказнасць вучонага** – маральныя аспекты ўзаемаадносін навукі і навуковай супольнасці з грамадствам у цэлым. Калі ў 19 ст. у навуцы бачылі крыніцу тэхнічнага і маральнага пераўтварэння грамадства (М. Бертла, Э. Рэнан), то пасля Другой сусветнай вайны на фоне пераканаўчых сведчанняў беспрэцэдэнтнай моцы навукова-тэхнічных дасягненняў становіцца відавочнай і ўсведамляецца неадназначнасць і небяспека сацыяльных і чалавечых наступстваў, а таксама саміх працэдур і працэсаў атрымання новых навуковых ведаў. Устала праблема таго, наколькі вучоныя нясуць адказнасць за вынікі сваіх даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# САЦЫЯЛЬНАЯ ФІЛАСОФІЯ

**Сацыяльная рэчаіснасць** – адзін з відаў рэчаіснасці, які ўзнікае ў выніку ўзаемадзеяння паміж сацыяльнымі групамі, інстытутамі і асобнымі людзьмі. Мае гістарычны характар.

**Грамадства** – сістэма адносін паміж людзьмі, якія гістарычна развіваюцца, складаюцца ў працэсе іх сумеснай дзейнасці і яе, гэтую дзейнасць, абумаўляюць.

**Сферы грамадскага жыцця** – асобныя вобласці грамадства, якія маюць свае спецыфічныя функцыі, характар і спосабы развіцця. Вылучаюць наступныя сферы: сферу матэрыяльнай вытворчасці (эканоміка), сферу кіравання (палітыка і права), духоўную сферу (мараль, мастацтва, рэлігія, філасофія, навука), сацыяльную сферу.

**Філасофія гісторыі** – раздзел філасофіі, які разглядае прыроду і законы сацыяльнай дынамікі, а таксама ажыццяўляе рэфлексію над гістарычнымі ведамі; рознымі аўтарамі разглядаецца альбо як падраздзел сацыяльнай філасофіі, альбо як сумежная ёй вобласць філасофскіх разважанняў.

**Фармацыйны падыход** – кірунак у сацыяльнай філасофіі, які прызнае накіраванасць развіцця, які праходзіць адны і тыя ж ступені развіцця – фармацыі, абумоўленыя адзінай сістэмай дэтэрмінацыі – спосабам матэрыяльнай вытворчасці як адзінства прадуцыйных сіл і вытворчых адносін.

**Грамадска-эканамічная фармацыя** – грамадства, узятае на пэўным этапе гістарычнага развіцця, з уласцівымі яму эканамічным базісам і ідэалагічнай надбудовай. Асноўнае паняцце матэрыялістычнага разумення гісторыі, якое было прапанавана марксізмам. Вылучаюць наступныя грамадска-эканамічныя фармацыі: першабытнаабшчынная, рабаўладальніцкая, феадальная, капіталістычная, камуністычная, першым этапам якой з’яўляецца сацыялізм. Маркс таксама вылучаў асобную фармацыю, якую назваў “азіяцкі спосаб вытворчасці”.

**Базіс** – гэта сукупнасць вытворчых адносін людзей, якія характарызуюцца формай уласнасці.

**Надбудова** – гэта палітычныя, прававыя, рэлігійныя, маральныя, мастацкія, філасофскія погляды грамадства і адпаведныя ім адносіны і ўстановы.

Гэтым паняццям надаецца вялікае значэнне ў марксісцкай філасофіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Быццё грамадскае** – філасофская катэгорыя, якая азначае сукупнасць матэрыяльных адносін людзей да прыроды і адзін да аднаго, незалежных ад іх свядомасці і ў канчатковым рахунку яго вызначальных.

**Свядомасць грамадская** – адлюстраванне ў свядомасці грамадскага быцця.

**Формы грамадскай свядомасці** – розныя формы адлюстравання ў свядомасці людзей аб'ектыўнага свету і грамадскага быцця, якія ўзнікаюць у працэсе практычнай дзейнасці. Грамадская свядомасць існуе і выяўляецца ў формах палітычнай ідэалогіі, прававой свядомасці, маралі, рэлігіі, навукі, мастацкіх поглядаў, мастацтва, філасофіі.

**Мадэрнізацыя** (ад фр. *moderne* – ʻновы, сучасны') – змены, якія адпавядаюць новым патрабаванням. Мае тры асноўныя праявы:

1. *Тэхнічная мадэрнізацыя* – абнаўленне аб'екта, прывядзенне яго ў адпаведнасць з новымі патрабаваннямі і нормамі, тэхнічнымі ўмовамі, паказчыкамі якасці.

2. *Гістарычная мадэрнізацыя* – працэс пераходу ад традыцыйнага да сучаснага грамадства, ад аграрнага да індустрыяльнага. Мае дзве формы: а) як унутранае развіццё краін Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі, якое адносіцца да еўрапейскага Новага часу; б) даганяючая мадэрнізацыя, якую практыкуюць краіны, якія не адносяцца да краін першай групы, але імкнуцца іх дагнаць.

3. *Праграмная мадэрнізацыя* – працэс поўнай або частковай змены грамадскай сістэмы з мэтай паскарэння развіцця, якую ажыццяўляе пэўная сацыяльная група альбо асоба.

**Постмадэрн** (лац. *post* – ʻпасля, праз'; фр. *moderne* – ʻсучасны') – адрэзак гістарычнага часу, які ахоплівае апошнія дзесяцігоддзі 20 і пачатак 19 ст., для якога характэрны рэзкі рост культурнай і сацыяльнай разнастайнасці і адмаўленне прынятай іерархіі каштоўнасцяў. Асноўная ідэя постмадэрну заключаецца ў тым, што сучаснасць (мадэрн) скончылася, і нічога новага ўжо не будзе.

**Культура** (от лат. *cultura* – ʻапрацоўка, выхаванне, адукацыя, развіццё') – спецыфічны спосаб арганізацыі і развіцця чалавечай жыццядзейнасці, які выражаецца праз вынікі матэрыяльнай і духоўнай працы, сістэму сацыяльных ўстаноў і норм, духоўныя каштоўнасці, адносіны людзей да прыроды, паміж сабой і самых сябе. Зараз існуе прыкладна 600 азначэнняў культуры. Гэта звязана, па-першае, са складанасцю самой культуры; па-другое, з разнастайнасцю падыходаў да яе: суматыўным, дзейсным, аксіалагічным, семіатычным, псіхааналітычным, экзістэнцыяльна-персаналістычным і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Дамінантная культура** (ад франц. *dominer* – ʻпанаваць’) – сукупнасць прынятых у грамадстве традыцый, вераванняў, норм, паводзін, каштоўнасцяў, звычаяў. Гэтыя прыкметы часта з’яўляюцца нормай для грамадства ў цэлым. Дамінантная культура, як правіла, дасягае панавання шляхам кантролю праз сацыяльныя інстытуты (рэлігія, шлюб, сям’я, адукацыя, войска, камунікацыі), мастацкую поп-культуру і эканоміку, юрыдычнае права і палітычную актыўнасць. Пры радыкальных зменах ў жыцці грамадства ўзнікае новая дамінантная культура.

**Субкультура** (лац. *sub* – ʻпад’ і *cultura* – ʻкультура’) – частка культуры грамадства, якая адрозніваецца сваімі паводзінамі ад пераважнай большасці, а таксама сацыяльныя групы носьбітаў гэтай культуры. Субкультура можа адрозніваццa ад дамінантнай культуры ўласнай сістэмай каштоўнасцяў, мовай, манерай паводзін, адзеннем і іншымі аспектамі. Адрозніваюць субкультуры, якія фармуюцца на нацыянальнай, дэмаграфічнай, прафесійнай, геаграфічнай і іншых асновах. У прыватнасці, субкультуры ўтвараюцца этнічнымі супольнасцямі, якія адрозніваюцца сваім дыялектам ад моўнай нормы. Іншым вядомым прыкладам з’яўляюцца моладзевыя субкультуры.

**Контркультура** (лац. *contra* – ʻсупраць’ і *cultura* – ʻкультура’) – агульная назва для субкультур другой паловы 20 ст., якія супрацьпастаўляюць сябе каштоўнасцям і нормам пануючай культуры, імкнуцца да канфлікту з ёй і прапануюць альтэрнатыўны стыль жыцця. У асноўным мае маладзёвы характар. Найбольш яскравы прыклад – рух хіпі.

**Прафесійная культура** – культура, якая ствараецца альбо спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі, альбо людзьмі, якія маюць выбітныя здольнасці да творчасці. Прадугледжвае наяўнасць у грамадстве спецыяльных устаноў для падрыхтоўкі спецыялістаў, узнікаюць структуры, якія забяспечваюць сацыяльнае функцыянаванне культуры (музеі, бібліятэкі, тэатры, кінатэатры, канцэртныя залы, НДІ), фарміруюцца ўстановы, якія кіруюць культурнай дзейнасцю (міністэрствы, камітэты, кіравання). Асаблівасці прафесійнай культуры: аўтарства, спецыялізаванасць, падзел на творцу і спажыўца культурных каштоўнасцей, высокі ўзровень майстэрства, таму яе называюць высокай культурай, наяўнасць узораў, патрабаванні да навыкаў, іннавацыйнасць, спалучэнне нацыянальнага і ўніверсальнага характару.

**Народная культура** – традыцыйная культура, якая ўключае культурныя пласты розных эпох ад глыбокай старажытнасці да цяперашняга часу, суб’ектам якой з’яўляецца народ. Да яе адносяцца абрады, казкі, паданні, песні, легенды, танцы, традыцыйныя рамёствы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Рысы народнай культуры:

– яе ствaральнікам і носьбітам з'яўляецца народ, а не канкрэтныя асобы;

– яна ствараецца непрафесійнымі творцамі, што не выключае высокага ўзроўню майстэрства;

– у ёй не выяўлены індывідуальны аўтарскі пачатак, яна ананімная;

– яна не інстытуцыяналізаваная, бо не мае патрэбы ў фармальных грамадскіх інстытутах, існуе і развіваецца сама па сабе праз традыцыю.

Народная культура адрозніваецца ад элітарнай прастатой зместу, яна дэмакратычная і зразумелая не толькі адукаванай эліце. Ад масавай культуры яна адрозніваецца сваім некамерцыйным характарам: мэтай народнай культуры не з'яўляецца атрыманне прыбытку.

**Масавая культура** (ад лац. *massa* – ʽглыба, камяк, кавалак') – культура, якая прызначана для спажывання ў мэтах адпачынку. Ствараецца па схемам індустрыяльнай вытворчасці: спачатку вывучаецца попыт, і потым па напрацаваных схемах робіцца твор. Прадугледжвае наяўнасць арганізаванай індустрыі спажывання і шырока разгалінаванай сеткай сродкаў масавай камунікацыі, якія аказваюць адпаведнае ўздзеянне на індывідуальную і грамадскую свядомасць і ствараюць неабходную рэкламу для забеспячэння шырокага попыту на яе прадукты. Можна вылучыць станоўчыя і адмоўныя наступствы распаўсюджвання масавай культуры ў сучасным грамадстве. Да першых адносяцца прадастаўленне чалавеку матэрыялу для разважанняў і магчымасці адпачыць ва ўмовах сучаснага напружанага жыцця, да другіх – спрошчаная трактоўка рэчаіснасці, прапанаванне ілжывых спосабаў вырашэння праблем, духоўнае спрашчэнне людзей.

**Элітарная культура** (фр. *elite* – ʽлепшае, адборнае', ад лац. *eligo* – ʽвыбіраю') – адна з субкультур 20 ст., наўмысна створаная для інтэлектуальна і мастацкі "прасунутых" асоб. Разглядае сябе не як культуру эканамічна і сацыяльна прывілегіяваных груп грамадства, а як культуру творцаў. Найбольш яскрава праяўляецца ў мадэрнісцкіх мастацкіх накірунках 20 ст. (кубізм, абстракцыянізм, сюррэалізм, экспрэсіянізм і інш.). Адметная іх рыса – нерэалістычны характар твораў і складанасць іх успрымання. Супрацьпастаўляецца масавай культуры. У мастацтве постмадэрнізму адбываецца сінтэз элітарнай і масавай культуры.

**Мадэрнізм** (ад фр. *moderne* – ʽновы, сучасны') – абазначэнне кірункаў у мастацтве 20 ст., якія ставяць сваёй мэтай новае бачанне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэчаіснасці. Характэрнымі рысамі мадэрнізму з'яўляюцца: крытычнае стаўленне да папярэдняга мастацтва, імкненне да навізны, адмаўленне ад рэалізму, складаны характар твораў, імкненне эпаціраваць публіку, разнастайнасць накірункаў, рэфлексіўны характар (наяўнасць мастацкіх праграм). Да мадэрнісцкіх кірункаў адносяцца кубізм, абстракцыянізм, суррэалізм, дадаізм і інш. У мастацтве канца 20 ст. на змену мадэрнізму прыходзіць постмадэрнізм.

**Дыялог культур** – спосаб узаемадзеяння паміж рознымі культурамі, элементамі якога з'яўляецца асэнсаванне адрозненняў, пошук шляхоў вырашэння праблем і абмен каштоўнасцямі.

**Аксіялогія** (ад грэч. *axia* – 'каштоўнасць' і *logos* – 'вучэнне, слова') – раздзел філасофіі, які вывучае каштоўнасці.

**Каштоўнасці** – аб'екты альбо з'явы, якія маюць станоўчае альбо адмоўнае значэнне для чалавека і грамадства (дабро, зло, прыгожае, брыдкае, справядлівасць, свабода, дабрабыт, здароўе). Каштоўнасці вынікаюць са спецыфікі чалавечага існавання: яго неад'емным кампанентам з'яўляецца дзейнасць, а яна павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з пэўнымі арыентырамі, якімі служаць каштоўнасці. Віды каштоўнасцей: матэрыяльныя (камфорт, багацце, дабрабыт), біялагічныя (здароўе, актыўнасць, працягласць жыцця, маладосць), сацыяльныя (законнасць, парадак, свабода), духоўныя (дабро, прыгажосць, самаадданасць, гераізм).

**Іерархія каштоўнасцей** (ад грэч. *hieros* – 'свяшчэнны', *arche* – 'улада, панаванне') – прынцып суаднясення, заснаваны на падпарадкаванні. Вылучаюць наступныя ўзроўні каштоўнасцей: матэрыяльныя, біялагічныя, сацыяльныя, духоўныя. Ніжэйшыя каштоўнасці павінны падпарадкоўвацца вышэйшым, пры гэтым кожны ўзровень захоўвае сваю значнасць.

**Цывілізацыя** (ад лац. *civilis* – 'грамадзянскі') – тэрмін сацыяльнай філасофіі і філасофіі гісторыі, які ў розных аўтараў і ў розных кантэкстах можа выкарыстоўвацца для абазначэння: 1) культуры; 2) толькі матэрыяльнай культуры; 3) гістарычнага этапу, які ідзе за дзікасцю і варварствам; 4) стадыі сацыяльнага развіцця, якая характарызуецца заняпадам культуры; 5) сукупнасці матэрыяльна-тэхнічных і духоўных дасягненняў чалавецтва; 6) сучаснага грамадства ў цэлым; 7) асаблівай формы арганізацыі грамадскага жыцця, заснаванай на своеасаблівай культуры і існуючай у пэўных (звычайна шырокіх) прасторава-часавых межах (лакальная цывілізацыя, напрыклад, кітайская). У цяперашні час фармуюцца падыходы, паводле якіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цывілізацыя ўяўляецца як нешта адзінае, якое знаходзіцца па-за рамкамі сацыяльных сістэм. Такія ўяўленні грунтуюцца на ідэі адзінства, цэласнасці сучаснага свету, прыярытэце агульначалавечых каштоўнасцей. Вылучаюць наступныя віды лакальных цывілізацый, якія існуюць у сучасным свеце: еўрапейская, кітайская, індыйская, мусульманская, афрыканская, лацінаамерыканская, руская.

**Філасофія тэхнікі** – асаблівая вобласць філасофскіх даследаванняў, накіраваных на асэнсаванне сутнасці тэхнічных феноменаў і ацэнку іх уздзеяння на чалавека, грамадства і культуру.

**Тэхніка** (грэч. *techne* – ʽмастацтва, рамяство, майстэрстваʼ) – сукупнасць створаных людзьмі сродкаў для пераўтварэння рэчаіснасці (прылад працы, механізмаў, машын, станкоў, апаратаў). Галоўная асаблівасць тэхнікі – яе інструментальны характар.

**Тэхналогія** (грэч. *techne* – ʽмастацтва, рамяство, майстэрстваʼ і *logos* – ʽслова, думка, сэнс, паняццеʼ) – сукупнасць спосабаў дзейнасці па пераўтварэнню рэчаіснасці.

**Тэхнакратызм** (ад грэч. *techne* – ʽмастацтва, рамяство, майстэрстваʼ, *kratos* – ʽуладаʼ) – сацыяльна-філасофская і ідэалагічная пазіцыя, згодна з якой улада ў грамадстве павінна належыць тэхнакратам (носьбітам тэхнічнага прагрэсу, вышэйшым пластам тэхнічных спецыялістаў); з’яўляецца складовай часткай канцэпцыі тэхналагічнага дэтэрмінізму.

**Тэхналагічны дэтэрмінізм** – канцэпцыя, якая разглядае прагрэс тэхнікі і тэхналогій у якасці галоўнага фактару, які абумаўляе развіццё грамадства ў цэлым; у яе рамках вылучаюць традыцыйны (аграрны), індустрыяльны і постіндустрыяльны (інфармацыйны) тыпы грамадства (цывілізацыі).

**Аграрнае грамадства** – грамадства, ў якім асноўны прадукт ствараецца ў сельскай гаспадарцы. Фарміруецца ў выніку неалітычнай рэвалюцыі – пераходу чалавецтва ад збіральніцтва і палявання да земляробства і жывёлагадоўлі, таксама ў асобную галіну вылучаецца рамяство. Неалітычная рэвалюцыя адбылася прыкладна 10 тыс. год таму.

**Індустрыяльнае грамадства** – грамадства, у якім асноўны прадукт ствараецца ў сферы прамысловасці. Тэрмін быў уведзены французскім філосафам і сацыёлагам Анры дэ Сэн-Сімонам. Сфарміравалася ў працэсе і ў выніку індустрыялізацыі, развіцця машыннай вытворчасці, узнікнення адэкватных яму форм арганізацыі працы, прымянення дасягненняў навукова-тэхналагічнага прагрэсу. Гэта грамадства, заснаванае на прамысловасці з гнуткімі дынамічнымі структурамі, для якога характэрны падзел працы і рост яго прадукцыйнасці, высокі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўзровень канкурэнцыі, паскоранае развіццё прадпрымальніцкага рэсурсу і чалавечага капіталу, развіццё грамадзянскай супольнасці і сістэм кіравання ўсіх узроўняў, шырокае развіццё сродкаў масавай камунікацыі, высокі ўзровень урбанізацыі і рост якасці жыцця. Індустрыяльнае грамадства ўзнікае ў выніку прамысловай рэвалюцыі.

**Прамысловая рэвалюцыя** (прамысловы пераварот, Вялікая індустрыяльная рэвалюцыя) – масавы пераход ад ручной працы да машыннай, ад мануфактуры да фабрыкі, які адбыўся ў вядучых дзяржавах свету ў 18–19 стст. У выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі індустрыяльнае грамадства трансфармуецца ў постіндустрыяльнае.

**Постіндустрыяльнае грамадства** – грамадства, у якім асноўны прадукт ствараецца ў сферы паслуг і інфармацыйных тэхналогій. У сферу паслуг прынята ўключаць культуру, адукацыю, ахову здароўя, бытавое абслугоўванне. Постіндустрыяльнае грамадства арыентавана на інавацыі, і таму – на развіццё ведаў. Навуковыя распрацоўкі робяцца галоўнай рухаючай сілай эканомікі. Рэзка ўзрастае попыт на прафісіяналізм і разнабаковую адукаванасць.

**Інфармацыйнае грамадства** – грамадства, у якім большасць працоўных занята вытворчасцю, захоўваннем, перапрацоўкай і рэалізацыяй інфармацыі. Адбываецца павелічэнне ролі інфармацыі і інфармацыйных тэхналогій у жыцці грамадства; ствараецца глабальная інфармацыйная прастора праз СМІ і Інтэрнет; адбываецца развіццё электроннай дэмакратыі, інфармацыйнай эканомікі, электроннай дзяржавы, электроннага ўрада, лічбавых рынкаў, электронных сацыяльных і гаспадарчых сетак.

**Глабалізацыя** (лац. *globus* – ‘шар, маецца на ўвазе зямны’) – гэта працэс узмацнення ўзаемазалежнасці і падабенства лакальных грамадстваў, а таксама складання наднацыянальных і наддзяржаўных структур, якія накіроўваюць ход сацыяльнага развіцця ў маштабах усёй нашай планеты. Вылучаюць наступныя віды глабалізацыі: эканамічная – стварэнне адзінага рынку тавараў, паслуг і працоўнай сілы; палітычная – распаўсюджванне ў свеце адзіных прынцыпаў паводзін, стварэнне міжнародных арганізацый (самая вядомая – ААН); культурная – распаўсюджванне ў свеце культурных каштоўнасцей, створаных у межах розных нацыянальных культур. У апошні час ў асобны від вылучаюць інфармацыйную глабалізацыю – распаўсюджванне інфармацыі праз СМІ і Інтэрнет.

**Глабальныя праблемы сучаснасці** – комплекс праблем, якія закранаюць большасць краін свету. Да іх адносяцца: прадухіленне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сусветнай тэрмаядзернай вайны, раззбраенне і стварэнне ўмоў для развіцця міжнародных адносін на мірнай аснове; сацыяльнае развіццё і эканамічны рост у свеце; пераадоленне эканамічнай адсталасці; ліквідацыя на зямлі найбольш абуральных праяў сацыяльнай несправядлівасці – голаду і галечы; рацыянальнае і комплекснае выкарыстанне прыродных рэсурсаў; выпрацоўка і ажыццяўленне актыўнай дэмаграфічнай палітыкі і стратэгіі аховы навакольнага асяроддзя; развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне навуковых даследаванняў па выкарыстанні дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, праблемы адукацыі, аховы здароўя і інш. Глабальныя праблемы па самой сваёй сутнасці патрабуюць канцэнтрацыі намаганняў не толькі ў нацыянальных або рэгіянальных рамках, але і ў міжнародным маштабе.

**Футуралогія** (лац. *futurum* – ‛будучыня’ і грэч. *logos* – ‛вучэнне, слова’) – уяўленні аб будучыні чалавецтва, вобласць ведаў, якая ахоплівае перспектывы сацыяльных працэсаў. Тэрмін футуралогія прапанаваў у 1943 г. нямецкі сацыёлаг А. Флехтхейм, маючы на ўвазе нейкую надкласавую філасофію будучыні, супрацьстаялую ідэалогіі і ўтопіі. З пачатку 60-х гг. гэтае паняцце распаўсюдзілася на захадзе ў сэнсе – гісторыі будучыні, навукі аб будучыні, закліканай выявіць прагнастычныя функцыі ўсіх навуковых дысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЛІТАРАТУРА

1. Большой энциклопедический словарь: философия, социология, религия, эзотеризм, политэкономия / гл. науч. ред. и сост. С. Ю. Солодовников. – Минск : МФЦП, 2002.– 1008 с.

2. Всемирная энциклопедия: Философия / гл. науч. ред. и сост. А. А. Грицанов. – М. : АСТ, Минск : Харвест, Современный литератор, 2001.– 1312 с.

3. История философии : Энциклопедия / гл. науч. ред. А. А. Грицанов. – Минск : Интерпрессервис; Книжный дом, 2002. – 1376 с.

4. Краткий философский словарь / под ред. А. П. Алексеева. – 2-е изд. перераб. и доп. – М. : Проспект, 2008.– 496 с.

5. Любецкая, Е. М. Словарь терминов и персоналий по курсу «Философия» / Е. М. Любецкая. – Смоленск : НОУ ВПО СИБП, 2014. – 64 с.

6. Новая философская энциклопедия : в 4 т. / ред.: В. С. Степин. – Ин-т философии РАН, Нац. общ.-научн. фонд. – Москва : Мысль, 2010. – Т. I. – 2010. – 744 с.; Т. II. – 2010. – 634 с.; Т. III. – 2010. – 692 с.; Т. IV. – 2010. – 736 с.

7. Новейший философский словарь / сост. и гл. науч. ред. А. А. Грицанов. – Минск : Интерпрессервис : Кн. дом, 2001. – 1279 с.

8. Постмодернизм: энциклопедия / сост. и науч. ред. : А. А. Грицанов, М. А. Можейко. – Минск : Интерпрессервис : Кн. дом, 2001. – 1038 с.

9. Словарь философских терминов / науч. ред. профессора В. Г. Кузнецова. – М. : ИНФРА-М, 2005. – 731 с.

10. Современная западная философия : словарь / ред. В. С. Малахов, В. П. Филатов. – М. : ТОН-Острожье, 1998. – 544 с.

11. Современный философский словарь / ред. : В. Е. Кемерова, Т. Х. Керимова. – М. : Академический проект, 215. – 823 с.

12. Философия. Краткий тематический словарь / ред. : Т. П. Матяш, В. П. Яковлева. – Феникс, Ростов-на-Дону, 2001. – 416 с.

13. Философия: словарь общеупотребительных философских понятий и категорий / сост. : О. А. Гордеева, Н. Ф. Свобода. – Самара : СамГУПС, 2010. – 14 с.

14. Философский словарь : пособие для самостоятельной работы студентов всех специальностей и всех форм обучения / сост. : Б. Я. Пукшанский, А. В. Рыбчак; Национальный минерально-сырьевой университет «Горный». – С-Пб., 2012. – 77 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

15. Философский словарь / под ред. И. Т. Фролова. – 7-е изд. перераб. и доп. – М. : Республика, 2001.– 719 с.
16. Философский энциклопедический словарь / гл. ред. : Л. Ф. Ильичев [и др.]. – Москва : Сов. Энциклопедия, 1983. – 840 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вытворча-практычнае выданне

**Адзіночанка** Віктар Аляксандравіч

# АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ ФІЛАСОФІІ

Практычнае кіраўніцтва

Рэдактар А. А. Нягодзіна
Карэктар В. У. Калугіна

Падпісана да друку 24.01.2022. Фармат 60х84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія. Ум. др. арк. 2,1.
Ул.-выд. арк. 2,3. Тыраж 50 экз. Заказ 36.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны"
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 3/1452 ад 17.04.2017.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013.
Вул. Савецкая, 104, 246028, Гомель

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**В. А. АДЗІНОЧАНКА**

# АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ ФІЛАСОФІІ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомель
2022